№ 46 (543)
Снежань 2014 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ Прадаўжальнікі: *моладзевая «Майстэрня Танцаў» –* *стар. 2*

☞ Год 1914-ы: *у акопах на беразе Нарачанкі –* *стар. 4*

☞ Наша гісторыя: *вавёрка Вялікай Бераставіцы –* *стар. 5*





14 снежня – прысвятак Навум, дзень, калі сяляне пачыналі вучыць грамаце сваіх дзяцей

Ілюстрацыі Васіля Шаранговіча да раздзела «Дарэктар» (паэма Якуба Коласа «Новая зямля»)

Маршрутам выхаднога дня

29 лістапада вучні сярэдняй школы № 1 г. Івацэвічы праехалі па маршруце Слонім – Ружаны – Косава. Школьнікі наведалі Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя І.І. Стаброўскага, музей «Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў» і музей-сядзібу Тадэвуша Касцюшкі ў Мерачоўшчыне. Вельмі прыемна, што турыстычны шлях дапамог нам аб'яднаць Брэсцкую і Гродзенскую вобласці.

Спадзяемся, што маршрут выхаднога дня будзе цікавы не толькі вучням, але і дарослым людзям, якія цікавяцца гісторыяй роднага краю.

Вольга ДАЙЛІД,
настаўніца гісторыі СШ № 1
г. Івацэвічы

На тым тыдні...

✓ **29 лістапада** ў мінскім Цэнтры сучасных мастацтваў адбыліся **Публічныя папярэднія прагляды IV Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага кіно «Cinema Perpetuum Mobile»**. У новай праграме – дваццаць шэсць фільмаў розных жанраў з дванаццаці краінаў свету, у тым ліку крымінальная камедыя з Францыі ў стылі Гая Рычы, фільм з Бразіліі на тэму экаактывізму ў Лацінскай Амерыцы, а таксама трапічная меладрама з Астравоў Кука.

✓ **2 снежня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адкрылася **юбілейная выстаўка Андрэя Смаляка «Жыццё. Жывапіс. Каханне»**, ганаровага акадэміка Еўрапейскай акадэміі мастацтваў, сябра Беларускага саюза мастакоў. У экспазіцыі прадстаўлена больш за сто жывапісных працаў, якія адлюстроўваюць усе этапы творчасці мастака, у тым ліку і арыгіналы ўнікальнага аўтарскага праекта «Ажылыя карціны», а таксама новыя творы.

✓ **3 снежня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя выдання «Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя»** ў чатырох тамах – фундаментальнага даследавання літаратурнага працэсу нашай краіны. Унікальная, маштабная па сваёй навуковай значнасці праца створаная вялікім калектывам аўтараў і рэдактараў на базе філіяла Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы – Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

У межах імпрэзы адбылося адкрыццё выстаўкі «Літаратурная спадчына XX стагоддзя», падрыхтаванай супрацоўнікамі бібліятэкі. Экспазіцыя знаёміць з найбольш грунтоўнымі і важнымі выданнямі, што пабачылі свет дзякуючы плённай працы супрацоўнікаў інстытута. Так, на выстаўцы можна пабачыць збор твораў Якуба Коласа ў 20-і тамах, поўны збор твораў Янкі Купалы ў 9-і тамах, збор твораў Максіма Танка ў 13-і тамах, збор твораў Івана Навуменкі ў 10-і тамах.

✓ **4 снежня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі Вячаслава Бандарэнкі «Полководцы и военачальники Первой мировой войны – уроженцы Беларуси»**, што выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Кніга распавядае пра генералаў-беларусаў, якія дасягнулі вышэйшых ступеняў адзнакі ў расійскай арміі ў 1914 – 1918 гг.

✓ **5 снежня быў адкрыты** першы ў Беларусі **помнік паэту Максіму Танку**, створаны па праекце скульптараў Івана Міско і Аляксандра Фінскага, а таксама архітэктара Армена Сардарава. Ён усталяваны ў Мядзелі на плошчы Шаранговіча і ўяўляе сабою бронзавую фігуру паэта на гранітным пастаменце. Непадалёк размешчаны валун з картушам у выглядзе раскрытай кнігі, дзе выбітыя словы з верша Максіма Танка: «Ёсць адна песня песняў – пра Радзіму».

✓ **8 снежня** ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі адкрылася **персанальная выстаўка Міхаіла Буліча «Архімары»** з серыі «Этнаграфія гарадскога мастацтва». Выстаўка стала спробай даследаваць калектыўнае несвядомае з дапамогай творчасці дэвіянтнага мастацтва, магчымасцю распавесці пра каштоўнасць падобнага мастацтва не толькі грамадству, але і самім людзям, а таксама – зірнуць на свет крыху іншымі вачыма – больш памяркоўнымі, мудрымі і добрымі.

А яго перапёлка лятае…

У Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адкрылася выстаўка «Іван Чыгрынаў. Пісьменнік і час». Экспазіцыя прымеркаваная да 80-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, грамадскага дзеяча – Івана Гаўрылавіча Чыгрынава (1934 – 1996).

Творчасць пісьменніка – адна з яркіх старонак беларускай літаратуры. На выстаўцы прадстаўленыя выданні твораў, многія з якіх перакладзеныя на розныя мовы свету. Імя І. Чыгрынава добра вядомае не толькі ў літаратуры. Рэжысёрам І. Дабралюбавым па раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы» на кінастудыі «Беларусьфільм» створаны шматсерыйны тэлевізійны фільм «Плач перапёлкі». Паводле рамана «Плач перапёлкі» кампазітар У. Кандрусевіч напісаў аднайменную сімфонію.

І. Чыгрынаў добра спалучаў пісьменніцкую дзейнасць з актыўнай грамадскай працаю. У 1978 г. быў у складзе дэлегацыі БССР на XXXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. З 1986 па 1990 г. – дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Працаваў у пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета БССР па нацыянальных пытаннях і міжнацыянальных адносінах. Цягам амаль 10 гадоў узначальваў Беларускі фонд культуры. Быў галоўным рэдактарам часопіса «Спадчына». На выстаўцы экспануюцца дакументы, якія распавядаюць пра грамадскую дзейнасць І. Чыгрынава.

Прыцягваюць увагу матэрыялы з сямейнага архіва, сярод якіх рукапісы, дакументы, фотаздымкі, нататнікі, асабістыя рэчы. Гэтыя ўнікальныя экспанаты прадастаўленыя жонкай пісьменніка Людмілай Прохараўнай.

Выстаўку «Іван Чыгрынаў. Пісьменнік і час» можна наведаць да 5 студзеня 2015-га.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Узяліся ў бокі і пайшлі ў скокі…

…на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе 26 лістапада адбылася першая вечарына з цыкла «Майстэрня Танцаў». Дзякуючы выкладчыцы кафедры фізічнай культуры і спорту Святлане Гоглевай, якая запрасіла да ўдзелу Танцавальную суполку гурта «GUDA» і музыкаў, прайшлі майстар-класы па традыцыйных і гуртавых танцах з гульнямі ды спевамі.

Галоўны харэограф і кіраўнік танцавальнай часткі гурта «GUDA» Мікола Козенка разам з Аленай Каліноўскай, якая вядзе заняткі для пачаткоўцаў, цярпліва паказвалі розныя беларускія танцы, пакуль усе не зразумелі, куды і як трэба «круціцца». Пад час «Полькі з камандамі» ды «Мяцеліцы» гучаў зычны голас аднаго з лепшых танцораў суполкі Улада Пінязіка.

Пасля хуткіх танцаў – «Лявоніхі», «Полькі», «Вераб'я», «Карапета» – можна было адпачыць пад час вельмі душэўнай павольнай «Падыспані» ды паслухаць спевы гуртоў «Багач» і «GUDA». Калі ўсе разам танчылі гуртавую польку, зала літаральна напоўнілася атмасферай еднасці і шчырай радасці. Танец, асабліва народны беларускі, выклікае толькі сапраўдныя і добрыя эмоцыі. Той, хто дагэтуль лічыць, што беларусы – сумны народ, яшчэ не бачыў, як яны танчаць «Кракавяк» або «Каваль» і як тады ўсміхаюцца.

Вывучаць беларускія танцы, традыцыйную манеру іх выканання, спасцігаць майстэрства скокаў і імправізацыі даволі лёгка – дастаткова толькі паспрабаваць. Наогул, нашыя продкі не вучыліся танчыць, яны лічылі гэта такім жа натуральным, як дыхаць.

Варта сказаць таксама пра Студэнцкае этнаграфічнае таварыства, удзельнікі якога ладзяць адмысловыя экспедыцыі. У 2012 годзе ў Докшыцах маладыя даследчыкі запісалі такое выказванне:

– Полька была дробная на два часы. На час – эта закон! Іграюць на куце гармошка, цымбалы і бубен. А што бубен даваў? Бубен даваў сама… Ой, а-яй-а-яй-а-яй! Што бубен даваў! І польку. Як хлопцы такі добра танцаваць умелі, дзеўку падбіраіць сабе, на час закладаваюцца: хто кага перагуляіць. Выходзіш, так кофтачку выціраіш. Зразу нічога ні нада табе.

Вельмі важна, што ў прыпеўках ды танцах захавалася беларуская мова, усе з задавальненнем слухалі і далучаліся да спеваў. Прыкладам, пад час гульні «Грэчанікі» спяваюць:

Пайшла баба па сялу
Грэчнай мукі здабываць,
Грэчнай мукі здабываць,
Грэчанікі учыняць.

Гоп, мае грэчанікі,
Гоп, мае ячны,
Чаму мае грэчанікі
Такі неўдачны?

Сёлета ў Мастах пад час экспедыцыі быў такі дыялог:

– Вы гаварылі, што дзеўкам з дзеўкамі нельзя была танцэваць.

– А ніяк! А ніяк. У нас праседзіць дзеўка цэлы вечар, і яе як ні возьмуць – яна дахаты пойдзе. Яна не выйдзе ў колэчка танцэваць. У нашым возрасьце так была.

Адным словам, усе, хто захапляецца беларускай культурай, шукаюць яе карані, месца традыцыйных каштоўнасцяў у сучасным жыцці, знойдуць усё гэта на танцавальных вечарынах. Запрашаем!

Аліцыя Ружа
ЗАРЭМБА

Мы глядзім у 1939-ы

У сядзібе выдавецтва «Галіяфы» 20 лістапада адбылася прэзентацыя кнігі Анатоля Трафімчыка «1939 год і Беларусь: забытая вайна». Тое, што кніга з'явілася менавіта сёлета, невыпадкова: яе выданне было прымеркаванае да сямідзесяці пяці гадоў з дня пачатку Другой сусветнай вайны і далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Ды і ўвогуле аўтар расказвае ў ёй пра адзін з самых пакручастых гадоў у гісторыі Беларусі. Перш чым кніга была прадстаўленая зацікаўленым гісторыяй у Мінску, яе прэзентацыі прайшлі ў Ганцавічах (сам А. Трафімчык нарадзіўся ў вёсцы Вялікія Круговічы Ганцавіцкага раёна), Баранавічах ды іншых гарадах.



А. Янушкевіч

Як заўважыў выдавец кнігі Андрэй Янушкевіч, А. Трафімчык – не проста гісторык, ён гісторык па натхненні і па прызванні. І хаця кніга «1939 год і Беларусь: забытая вайна» напісаная на навукова-папулярным узроўні, прафесійнасць аўтара добра ў ёй адчуваецца. І што вельмі важна, адзначыў А. Янушкевіч, – у кнізе прадстаўлены беларусацэнтрычны погляд на праблему:

– Цяпер ёсць расійскія ды польскія працы, і іх ідэі ўплываюць на нашае бачанне тых падзеяў. У кнізе ж Анатоля Трафімчыка адлюстраваны хай сабе і аўтарскі ды ў чымсьці суб'ектыўны, але погляд менавіта беларускага гісторыка, які і сам нарадзіўся ды жыве на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Сам А. Трафімчык патлумачыў, што ён паспрабаваў прадставіць Беларусь як хай сабе і слабенькі, але ж усё-такі суб'ект гісторыі:

– Хаця калі Чэрчыль, Сталін і Рузвельт дзялілі свет, Заходняя Беларусь была для іх проста зярняткам, – адзначыў аўтар. – Тым не менш, не ўсе этнічна беларускія землі парэзалі на кавалкі, каб павялічыць імі тэрыторыі суседніх краінаў.

Асабліва ж варта адзначыць, што веды пра тыя часы А. Трафімчык браў з першакрыніцаў, ад людзей, якія яшчэ помняць мінулыя падзеі.

У той жа час нельга сказаць, што меркаванні аўтара аднабаковыя: так, у кнізе прыведзеная і вытрымка з дзённіка акадэміка Вернадскага аб тым, што «захоп Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны – гэта добрая справа на карысць дзяржавы» (у чымсьці з гэтым нельга не пагадзіцца, бо і тады, і сёння тая дзяржава мела свае інтарэсы, якія старанна падтрымліваліся). Думаецца, гэтае выданне выдатна пацвярджае думку, што гісторыя – з'ява цыклічная, і тое, што адбываецца цяпер, калісьці раней ужо было. У нашым жа выпадку па прыклады далёка хадзіць не трэба: у тых падзей, што адбываюцца сёння, змяніўся хіба што год.

А. Трафімчык

Што ж, цяпер беларусы маюць сваю кнігу пра 1939 год, і гэта стала – не, не мяжою, але – размежаваннем паміж тым, якім бачаць гэты час розныя людзі. І няхай погляд беларусаў не можа ахапіць усю паўнату колішніх падзеяў, але без яго не складзецца цэласная карціна таго часу.

Ніна КАЗЛЕНЯ
Фота аўтара

Успаміны, вартыя ўвагі

Сёлета ў Мінску ў друкарні «Лімарыус» выйшла кніга ўспамінаў аб мястэчку Лужкі Васіля Стомы (1911–1992). Выданне мае назву «Маё мястэчка», да друку яно падрыхтаванае дзякуючы Беларускаму інстытуту навукі і мастацтва (БІНіМ), Лявону Юрэвічу, Змітру Саўку, Наталлі Гардзіенка і іншым рупліўцам. Таксама падрыхтоўцы ўспамінаў спрыялі Мікола Атрахімовіч (Лужкі), Леанід Кананові́ч (Мінск), Ада Райчонак (Германавічы) ды іншыя.

Васіль Стома, выдатны беларускі пісьменнік, нарадзіўся ў мястэчку Лужкі 4 сакавіка 1911 г. Пад час вайны працаваў у Дзісне, пасля выехаў у Еўропу і адтуль у 1949 г. у ЗША. У эміграцыі ён і напісаў кнігу ўспамінаў аб родным мястэчку Лужкі, якая стала данінай памяці мясцінам дзяцінства і сталення, адначасова такім блізкім і далёкім.

Кніга складаецца з такіх частак: «Прадмова», «Слова моўнага рэдактара», «Маё мястэчка», «Абрады і звычаі Дзісеншчыны», «Пра чалавека, што прышываў гузік Эйнштэйну (Васіль Стома ва ўспамінах стрыечнага брата)», «Каментары» і «Змест».

Асноўны раздзел пад назвай «Маё мястэчка» (напісаны ў 1978 г.) складаецца з трох падраздзелаў, кожны з якіх мае свае пэўныя тэматычныя часткі. Падраздзел I падзяляецца так: невялічкі аўтарскі ўступ, «Агульны агляд. Галоўныя вуліцы», «Рынак. Лужына», «Воўка-пажарнік», «Янця», «Бляхарыха», «Беламорды», «Дарахвей», «Міхалачка і Адась», «Успаміны з рынку» ды «Конскі рынак».

З аўтарскага ўступу даведваемся пра тое, што Васіль з маці і дзвюма меншымі сёстрамі вярнуліся на Беларусь з Украіны, дзе знаходзіліся ў бежанстве, у якое сям'я Стомаў была адпраўленая прымусова ў 1915 г. з-за набліжэння лініі фронту. З бежанства не вярнуўся бацька Васіля, які там і памёр. Васілю з маці і сёстрамі даў часовы прытулак родны матчын брат, што працаваў паштовым чыноўнікам на чыгуначнай станцыі Балагое. Потым сям'я перайшла жыць да Васілёвага дзеда, які неўзабаве памёр. Аўтар прыгадвае свае першыя вуліцы: Гарманаўскую і Тумалёнкаву, першыя экскурсіі да Рынка.

У тэматычнай частцы «Агульны агляд. Галоўныя вуліцы» перад намі ва ўсёй сваёй прыгажосці паўстае мястэчка Лужкі, размешчанае амаль у цэнтры Дзісенскага павета, на ўзвышшы, абвітае бруістай рэчкай Мнютай. У цэнтры Лужкоў мы ўбачым Рынак, царкву з зялёным дахам і велізарным купалам, а на ўскрайку – касцёл з высокімі гатычнымі вежамі ды стромкім спадзістым дахам. Акрамя таго, у мястэчку было некалькі сінагогаў, польская і яўрэйская пачатковыя школы, яўрэйскі банк, паліцыя, суд, гміна (валасная ўправа), невялічкі шпіталь, што быў закрыты польскімі ўладамі ў 1930-х гг., больш за 20 крамаў, рэстаран, тры піўныя ды цукерня Фукса.

Касцёл у Лужках

Пашпацыруем яшчэ па брукаванках Лужкоў і ўбачым казармы КАП (корпуса аховы памежжа, у мястэчку стаяў 5-ы батальён КАП «Лужкі»), пабудаваныя ў канцы 1920-х гг., зойдзем у млын графа Плятэра – заўважым там электроўню (электрастанцыю). Паплаваць спякотным летам ды палавіць карасёў ды ўклеек можна было ў возеры, якое таксама было ў мястэчку. Пра тое возера існавала легенда, што на яго дне стаіць затоплены касцёл. Калі пройдземся паміж Лужкамі і графскім маёнткам Гарадзец, натрапім на вялікі запушчаны парк пад назвай «Звярынец» (уласнасць Плятэра), дзе любілі адпачываць местачкоўцы. Тут яшчэ варта згадаць назвы пяці галоўных вуліцаў мястэчка, якія падаюцца ў тэматычнай частцы «Рынак. Лужына»: Дзісенская (найбольшая), Гарманаўская (адна з найменшых), Касцельная (празваная Свіной), Млынская ды Маставая.

Другі падраздзел складаецца з частак «Школа», «Настаўнік Кэйзік», «Кіраўнік Баліцкі», «Гарманаўская вуліца», «Доктар Усевалад Шыран», «Дзед Ярох», «Бабка Крыстына», «Буры», «Гасподаж», «Цётка Юлька», «Моспядзі» і «Мае дзядзькі». Давайце пагледзім тэматычную частку «Дзед Ярох» (Янка Ярахновіч). Дзед Ярох вельмі цікавы персанаж, які заслугоўвае ўвагі. Вось які ён меў выгляд: «Сярэдняга ўзросту, шыракаплечы, з цёмнымі, ледзь кранутымі сівізной, даволі доўгімі валасамі і такога ж колеру шырокай круглай барадой, з не па-старэчы сінімі, як васількі, вачыма і румяным тварам. Цікава, што ніхто ў мястэчку не ведаў, колькі дзеду Яроху было гадоў, а, пэўна, быў ён дужа стары. Вельмі любіў гэты дзед апавядаць аб старых часах: пра тое, што, быўшы малым хлапцом ды з сябрамі седзячы на плоце, ён бачыў, як «пранцузы з маскалямі ваявалі», аб «мяцежніках» (пэўна, аб паўстанцах Каліноўскага) і вельмі ганьбіў пры гэтым пана Яцыну (гэтае прозвішча сустракаецца ў «Спісе ўдзельнікаў паўстання 1831 г. у Дзісенскім павеце» з такой пазнакай: «Яцына з Магілёўскай губерні. Пагражаў расстрэлам тым, хто не ідзе ў паўстанцы»). Быў дзед Ярох дужа працавітым; калі некаторыя местачкоўцы на гарох, авёс ці ячмень ужывалі машыны, то ён малаціў усё без выключэнняў толькі цапом ды лупіў так, што маладыя за ім не паспявалі.

Засекі ў свіронку Яроха заўжды былі поўнымі, таму вясной да яго прыходзілі браць пазыку на пасеў тыя местачкоўцы, якім не хапіла зерня, і ім ён ніколі не адмаўляў і адсоткаў за карыстанне зернем не прызначаў. Злодзеяў дзед ненавідзеў, аднак шкадаваў тых, каго да злачынства прывяла сапраўдная бяда. У царкву ён хадзіў рэдка, алё заўсёды падкрэсліваў, што праваслаўны, вельмі абураўся, калі хтосьці няўважна адносіўся да рэлігіі, быў жанаты, здаецца, разы тры, святароў, як праваслаўных, так і каталіцкіх, не пераносіў (па невядомай прычыне), а таксама – лекараў, бо меў моцнае здароўе. Памёр дзед Ярох не як усе людзі: зранку схадзіў у лазню, выдаў загады сям'і да працы, паспавядаўся святару, папрасіў выбачэння ва ўнука, загасіў грамнічную свечку, перахрысціўся, прашаптаў малітвы, лёг на ложак ды адыйшоў... Па падліках старэйшых людзей, дзеду на дзень смерці было больш за 130 гадоў, пры тым, што выглядаў ён гадоў на 65 – 70. Вось такім быў дзед Ярох».

У трэцім падраздзеле распавядаецца пра Дзісенскую і Маставую вуліцы, народны дом, суд, айца Язэпа Германовіча, раку Мнюту, Тумалёнкаву вулку ды іншае. Зазірнем на Маставую вуліцу, самую ўтульную вуліцу мястэчка, што патанала ў зеляніве дрэваў. Сваім канцом Маставая вулка амаль упіралася ў раку Мнюту, на другім беразе якой знаходзіліся яўрэйскія могілкі. На Маставой стаяў дом пад назвай «Шылаватка», які быў найбольшым і найвыдатнейшым сярод іншых хатак гэтае вуліцы. Маставая вуліца мела найлепшую ў мястэчку брукаванку са шчапанага плоскага камення, укладзенага ў 1920-х гг., што давала магчымасць не дужа калаціцца, едучы на возе. Быў там і пракат самакатаў, які ажыццяўляўся ў гадзіннікавай краме Грыкінера. Малы Васіль, сабраўшы 60 грошаў, мог цэлую гадзіну лётаць на сапраўдным самакаце, што лічылася тады сярод местачковых хлапчукоў найшыкоўнай раскошай.

Руіны сінагогі ў Лужках

Частка «Абрады і звычаі Дзісеншчыны» мае ў сабе два раздзелы: «Абрады, звязаныя з рэлігійнымі святамі» і «Абрады сямейнага характару».

У першым згадваюцца такія святы, як Калядныя, Грамніца, Запусты-масленіца, Вялікі пост, Саракі, Вялікдзень, Дзяды (памінкі, асяніны) ды іншыя. Калядны звычай «Цярэшка» быў своеасаблівым менавіта на Дзісеншчыне і мала распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі, таму на гэта пры чытанні раздзела варта звярнуць асаблівую ўвагу. Вось адна з песняў, што гучала пад час гэтага свята:

Даганяй сваю долю, дзядок,
Падары ёй срэбны
грабянёк,
Пуд пернікаў медавых
Ды гарэшкаў залатых.

Другі раздзел – «Святы сямейнага характару» – утрымлівае ў сабе наступныя святы: нарадзіны, хрэсьбіны, сватаўство і вяселле, што ахопліваюць асноўны цыкл жыцця чалавека. Не хапае тут толькі памінак, але навошта азмрочваць чытачу настрой жалобнымі абрадамі?

Цікавай з'яўляецца частка «Пра чалавека, што прышываў гузік Эйнштэйну (Васіль Стома ва ўспамінах стрыечнага брата)», напісаная Наталляй Гардзіенка. Паводле ўспамінаў брата Яўгена Кананові́ча, В. Стома ў 1939 г., калі прыйшла савецкая ўлада, працаваў у Дзісне сакратаром у райана ці бухгалтарам. Яго былая калега Вольга Грыцук зазначыла, што пад час нямецкай акупацыі В. Стома працаваў у гаспадарчым аддзеле раённай адміністрацыі, а пры наступленні Чырвонай Арміі разам з сям'ёю ды ўсёй адміністрацыяй выехаў у Нямеччыну. Сувязь са стрыечным братам Я. Кананові́чу ўдалося наладзіць толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў, а ў 1974 г. ён наведаў сям'ю Стомаў у Нью-Брансуіку (ЗША). Там В. Стома працаваў шаўцом у вялікай краме адзення і нават прышываў гузік выбітнаму фізіку Альберту Эйнштэйну, не ўзяўшы з яго грошай, з павагі да таленавітае асобы.

У кнізе змешчаныя і фотаздымкі: «Васіль Стома з маці і сёстрамі», «Руіны сінагогі ў Лужках», «Васіль Стома з сястрою і суайчыннікамі. Каляды 1988 – 1989 гг., ЗША» ды іншыя. Кнігу завяршаюць «Каментары», што даюць магчымасць чытачу высветліць незразумелае для сябе, асаблівасці мовы аўтара.

Мяркую, што такое змястоўнае выданне не пакіне чытача абыякавым, дасць яму новыя веды і магчымасць цікава правесці вольны час.

Ігар КАНДРАТОВІЧ,
г. Мёры

У акопах
на беразе Нарачанкі

На вячэры ў немцаў

(Успаміны Мікалая Сільвестравіча Варановіча, 1885 г. нар., запісаныя 17 жніўня 1976 г.[1])

Улетку 1915 года некалькі мужчын (1884 і 1885 года нараджэння) з вёскі Касічы (у тым ліку і мяне) рускія мабілізавалі і адправілі капаць акопы каля горада Ліда. Твой дзед Іллюк Варановіч адразу адтуль уцёк дамоў, бо ў яго дома жонка засталася маладая і трое дзяцей. Вярнуўшыся дамоў, ён са сваёй сям'ёй паехаў як уцякач у Сібір, у Енісейскі край. А мы капалі акопы, пакуль немцы не прарвалі фронт. З-пад Ліды нас трое дабіраліся дамоў як маглі. Ад Маладзечна мы ішлі праз Маркава і Лебедзева на Гануту. Выйшлі ў лесе позна ўвечары да кастра. Гэта былі немцы, але мы былі галодныя, змораныя і не было куды ўцякаць. Сказалі, што тутэйшыя і ў лесе заблудзіліся. Адзін з іх добра гаварыў па-польску, і ён запрасіў нас на вячэру. Мы вельмі абрадаваліся такой гасціннасці. Вячэра была ўжо гатова, але чамусьці спатрэбілася вада. Я пайшоў да рэчкі па ваду. Набраўшы ў кацялок вады, я заўважыў бліскучую драціну, працягнутую праз рэчку. Дом ужо недалёка, а дрот у гаспадарцы не памяшае. Трэба яго ўзяць. З горам папалам адламіў кавалак і зматаў у скрутак. Набыты трафей прынёс да кастра. Калі прышоў, то вельмі здзівіўся – мае падарожнікі сядзяць каля кастра, а немцаў няма.

– Дзе немцы?

– А хто іх ведае. Некуды пільна пайшлі. А ты што прынёс?

– Во дроту дастаў. Вісеў на кустах, – кажу ім.

– Ты ж там не вешаў. Навошто браў. Гэта тэлефонны провад. Кідай хутчэй у кусты, а то калі вернуцца немцы, то заб'юць цябе, ды і мы невядома ці ацалеем. Гэта яны спалохаліся, што ў іх сувязь прапала. Напэўна, уцяклі. А каб пайшлі правяраць лінію, то быў бы табе капут.

– Давайце хутчэй вячэраць. Сала звaранае астывае.

Мы хутка з'елі, што там было, і адправіліся ў Гануту. А для нас Ганута, як бы дома. Каля сямі вёрст па беразе сваёй ракі – гэта ўжо прагулка пасля такой дарогі.

Калі немцаў адагналі за Войстама, мяне ўзялі ў расійскае войска. Павучыўшы нядоўга ў Сімбірску, мяне адправілі ваяваць у Румынію. Там у нас былі 4 рускія корпусы ў цэнтры, а па баках – нашы саюзнікі (румынскія войскі). І вось мы аднойчы наступаем і наступаем, а немцаў усё няма і няма. А пасля даведаліся, што румыны ззаду ад нас свае пазіцыі здалі немцам. Тады мы двое сутак дзень і ноч уцякалі, каб немцы не закрылі нас у мяшок. Вышлі з акружэння, і фронт стабілізаваўся.

Немцы паспрабавалі нас апракінуць, мы – іх. Нічога не выйшла. Спыніліся ў акопах. Толькі пастраляем крыху, каб ведалі, што мы стаім. Здаралася, шараговы ходзіць па краю акопа і па ім ніхто з таго боку не страляе. А як афіцэр высуніць галаву, дык яго і заб'юць. Таксама забівалі і грамадзянскіх, бо хто з цывільных пойдзе на перадавую, калі не начальства.

Прыехаў раз неяк Керанскі да нас на фронт, тады ад яго мы даведаліся, што ў Петраградзе рэвалюцыя адбылася. Некаторыя афіцэры, якія баяліся сваіх салдатаў, паўцякалі ў другія часці.

Пазней расійскі генерал Юзаф Пілсудскі (беларускі паляк) сабраў польскіх афіцэраў і здраднікаў, дамовіўся з немцамі, захапіў артылерыю і пайшоў наступаць у Беларусь. У расійскай арміі было шмат афіцэраў-палякаў.

Пасля вайны я са сваёй жонкай Волькай жылі ў лазні, бо Касічы ў вайну згарэлі. Потым я ўжо ў цэнтры вёскі будавацца не стаў, а на краі вескі. Навазіў бярвенняў і пабудаваў вось гэту хату, у якой і жыву.

Дзіцячыя песні ў расійскіх акопах

У Касічах у 1912 годзе адкрылі школу граматы. У звычайнай сялянскай хаце заняткі з дзецьмі вёў адзін настаўнік. Школа магла быць і рухомая, калі яна перамяшчалася з хаты ў хату. У вёсках тады дзяцей было шмат. Мой бацька Вінцэсь у ёй вучыўся 2 гады, але ён не ўмеў правільна напісаць па-руску слова *потолок*. З яго за гэта смяяліся, што не навучыўся. Для яго не было зразумела і само слова, бо ў беларускай хаце ёсць столь і страха, а не *потолок* і *крыша*. І чаму ў слове *потолок* трэба пісаць аж тры літары *о*, калі чуецца пры вымаўленні толькі адна, на апошнім складзе.

У верасні 1915 года расійскія войскі ў час наступлення абстралялі з гарматаў вёскі Касічы і Кузьмішкі, што на правым беразе Нарачанкі. У Касічох немцы размясціліся ў гумнах. Узнік пажар. Паселішчы выгарэлі датла. Немцы пакінулі пазіцыі і адступілі. Сяляне гэтых вёсак засталіся без жылля. Пабудавалі часовыя зямлянкі і неяк жылі. Хто ў зямлянцы, а нехта ў лазні, калі яна ацалела. Тыя гаспадары, якія паспелі закапаць сваю маёмасць у скрынях у зямлю, выйгралі. У іх хоць нешта засталося.

У Ганцалях была другая лінія абароны расійскіх войскаў. Немцы замацаваліся на лініі Пронькі – Абрамаўшчына – Смаргоні. За вярсту ад яе ішла першая лінія абароны расійскай арміі. Ніхто з салдатаў у акопах у Ганцалях і ў бліндажах не ведаў, што з ім будзе заўтра. Наогул, ці выжыве ён у гэтай нікому не патрэбнай вайне.

Бацька мне расказваў не раз, як ён з іншымі касіцкімі дзецьмі хадзіў у акопы спяваць песні рускім салдатам. Акопы былі ў лесе Ганцалі, а два бліндажы – на полі Даўгінава, і яшчэ два бліндажы на струменскім полі Відугары, па левы бок ад дарогі Касічы – Струменне – Папоўцы. (Цяпер той дарогі ўжо няма. Яе рэшткі ў лесе яшчэ можна знайсці.) Якія песні спяваў мой бацька, калі яму было 9 гадоў, для расійскіх салдатаў? Іх я чамусці не запісаў. Магчыма, ён іх забыў. Але затое мая непісьменная маці Соф'я (1907 г. нар.) спявала мне салдацкія і казацкія песні. Назаву іх: беларускія – «У нядзельку раненька», «Спіўся казак, спіўся», «Барабаншчыкі б'юць...», «Ой, паля ж, вы, паля...»; рускія – «Последний нонешний денёчек», «Солдатская песня 1915 года». Вось фрагменты некаторых з іх.

Барабаншчыкі б'юць,
У засадачку ідуць.
Там народушка прыасталіся,
З сястой, з матушкай
распрашчаліся.
Матка плакала – урыдалася.
Сястра плакала –
ручаём слёзкі йшлі.
Жана плакала –
без ніякай расы.

Або – яшчэ песня, «У нядзельку раненька», якую запісаў мой брат Анатоль Барыс у 1962 годзе ад маці Соф'і Барыс.

У нядзельку раненька
Ўзышла зорка ясненка.
Тата коніка поіць,
Дужа жаласна плачыць.
– Чаго, татачка, плачыш?
Нашто коніка поіш?
– Табе, табе, сыночак,
На ваёнку паедзеш,
На ваёнку паедзеш
Ды адтуль не прыедзеш.
Павязеш свае плечы
Пад нямецкія мечы.
Павязеш ты галоўку
У чужую старонку.
– Не плач, татка, пры мне,
Наплачышся без мяне,
Наплачышся даволі,
Як ня ўвідзіш ніколі.

У 1916 годзе ў лесе Ганцалі былі дзіцячыя стыхійныя канцэрты. Іх ніхто не арганізоўваў. Калі дзіцяці хацелася есці і хацелася мець хоць нейкі пачастунак, дык яно адпраўлялася ў акопы да салдатаў. Паслухаўшы дзіцячыя песні аб салдацкай долі, салдаты ўспаміналі сваіх дзяцей і шкадавалі галодных і бяздомных беларускіх дзяцей у прыфрантавой паласе. У нашых дзяцей і салдатаў была адна доля і адно гора. Ваяры аддавалі дзецям тое, што мелі і маглі: цукар, цукеркі, крыху хлеба. Была хоць кароткая ўзаемная радасць – і дзіцячая, і салдацкая.

Сымон БАРЫС



Малюнак У. Малахава паводле праекта С. Барыса

[1] Захоўваюцца некаторыя асаблівасці мясцовай гаворкі.

(Заканчэнне ў наступным нумары)

Курадымны адбітак пячаці бераставіцкага магістрата. (1754)

Легенда герба Вялікай Бераставіцы

Да 260-годдзя надання магдэбургскага права Вялікай Бераставіцы

Кожны гарадскі герб Беларусі мае сваю легенду, якая адлюстроўвае гістарычны шлях станаўлення мястэчка ці горада. Герб «Вавёрка» Вялікай Бераставіцы таксама мае сваю легенду. Упершыню ён быў зацверджаны польскім каралём Аўгустам III Саксонскім 2 жніўня 1754 г. у Варшаве спецыяльным прывілеем на самакіраванне. Ініцыятарам надання магдэбургскіх правоў для Бераставіцы стаў яе тагачасны ўладальнік граф Ежы Аўгуст Мнішак (1715–1778), маршалак надворны каронны, асоба выбітная і ўплывовая ў палітыцы Рэчы Паспалітай сярэдзіны XVIII ст. Менавіта яму належыць здзяйсненне абранай тэматыкі герба Вялікай Бераставіцы.

А ўсё пачалося ў сям'і Е. Мнішка. Яго жонка графіня Марыя Амелія Фрыдэрыка Брюль (1736–1772) нарадзіла доўгачаканае дзіця. Дзяўчынка Юзэфіна (29 жніўня 1752 г., Дрэздэн) аказалася адзіным і любімым у сям'і Мнішкаў дзіцем. Маці акружыла дзяўчынку хатнім выхаваннем і адукацыяй. Сама Марыя Амелія лічылася жанчынай рэдкай прыгажосці, а сваім розумам і талентамі здзіўляла арыстакратычнае асяроддзе нават пры каралеўскім двары Рэчы Паспалітай. Яна была сапраўднай фартунай у палітычным жыцці Ежы Аўгуста Мнішка. Менавіта жонка параіла яму адзначыць нараджэнне дачкі ярка і сімвалістычна. У жніўні 1754 г. надыходзіў чарговы дзень нараджэння Юзэфіны. Бацькі да свята добра падрыхтаваліся – яны вырашылі падараваць сваёй дачцэ цэлае мястэчка – Бераставіцу. Маленькая дзяўчынка сядзела на скрутку, на якім быў намаляваны герб Вялікай Бераставіцы – «Вавёрка». Але гэты няўрымслівы звярок з'явіўся ў мястэчку не адразу.

На той час праз Бераставіцу праходзілі гандлёвыя шляхі з Гродна да Крынак, з Беластока да Ваўкавыска. Але сама Бераставіца не мела дазволу на гандаль з гэтымі гарадамі. Надзвычайныя просьбы бераставічанаў да Варшаўскай канцылярыі не далі вынікаў. Просьбы гэтыя дайшлі да ўладальніка Бераставіцы Е. Мнішка. Ён падтрымаў жыхароў і асабіста ўзмацніў просьбы аб наданні прывілея свайму мястэчку. На сярэдзіну 1750-х гг. прыйшлося супадзенне выгаднага гандлёвага месца і часу нараджэння доўгачаканай спадчыніцы ў Мнішкаў. Злучальнай ніткаю стаў магдэбургскі Прывілей, які і быў намаляваны на бераставіцкім гербе 1754 г. у выглядзе скрутка з віслай пячаткай. Менавіта скрутак і вылучаў Бераставіцу як гандлёвае месца. А вавёрка, якая ў геральдыцы параўноўвалася з гарнастаем – каралеўскім звярком, абраная Е. Мнішкам у якасці зацвярджальніцы ўсіх дакументаў, што прымаў бераставіцкі магістрат. І нездарма гэта запісана ў бераставіцкім прывілеі 1754 г. (захавалася яго копія ад 1797 г.), дзе можна прачытаць наступнае: *«На герб жа мейскі і пячаць для сцвярджэння актаў, спраў і лістоў сваіх таго мястэчка вавёрку сідзячую ўжываць будзьце»*. Нават калі б не захаваўся адзіны адбітак герба Вялікай Бераставіцы з пячаткі 1754 г., тады яго апісанне ў копіі прывілея 1797 г. ясна падказвала б, што вавёрка сядзіць на актах, справах і лістах свайго мястэчка. Адсюль і назва мястэчка Бераставіцы – «бераста вітая» альбо берасцяны скрутак, грамата. У XVIII ст. скрутак уяўляў сабой аркуш паперы, акта, прывілея як з віслай пячаткай, так і з яе адбіткам на дакуменце.

Партрэт Марыі Амеліі Бруль (Мнішак). Гравюра на медзі. Д. Кунега. (1785)

Партрэт Ежы Аўгуста Мнішка Гравюра на медзі. Д. Кунега. (1784)

Партрэт Юзэфіны Амеліі Мнішак. Гравюра на медзі Д. Кунега з арыгінала П. Батоні. (1783)

Вобраз вавёркі ў геральдыцы мае сваю алегорыю і параўноваецца з маладой жанчынай, нявестай. А жыццёвы лёс Юзэфіны Амеліі Мнішак, у замустве графіні Патоцкай, (1752 – 1798) якраз найбольш дапасуецца да легендарнай вавёркі Вялікай Бераставіцы. Вядома, што Юзэфіна стала мнагадзетнай маці, нарадзіла мужу 11 дзяцей (7 дачок і 4 сыны). Вавёрка таксама вядомая сваёй плоднасцю.

Графіня займалася маляваннем, вядомая як польская мастачка і пісьменніца-аматар. Знакамітыя мастакі-партрэтысты малявалі графіню Патоцкую са скруткам паперы і алоўкам у руках (Я. Лампі Старэйшы, П. Батоні). Гэта вельмі суадносіцца з выяваю бераставіцкай вавёркі на гербе 1754 г., дзе звярок сядзіць на аркушах свайго мястэчка. Герб вядомы толькі на курадымным адбітку пячаці, прыціснутай да дакумента, выпісанага з кнігаў Гродзенскага магістрата – «Копія акта Прывілея Вялікай Бераставіцы ад 7 красавіка 1797 г.». Рэзчык пячаці выбраў на гербе менавіта контурнае выкананне прывілея, звітага ў трубку, а вавёрку выканаў суцэльнай плямай. І ўсё гэта для таго, каб злучыць гандлёвае места Бераставіцу з яе будучым уладальнікам – жанчынай! Праз 20 гадоў, у 1774 г., Юзэфіна Амелія стала ўладальніцай Вялікай Бераставіцы, і месніцкая вавёрка атрымала сваё імя – Юзэфіна. Так стварылася легенда пра вавёрку-дзяўчынку, якой бацькі падаравалі на дзень нараджэнне цэлы гарадок. Калі дзяўчынка падрасла да замужжа, бацькі пацвердзілі ёй правы на валоданне гэтым мястэчкам.

Вавёрчын лёс таемнай ніццю прайшоў праз усё жыццё Ю. Мнішак, графіні Патоцкай. Яна – вогненая прыгажуня, прыцягвала да сябе ўвагу выбітных мужчынаў. То сагравала іх сваім полымем кахання, то абпальвала іх... Яна – багатая жанчына Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, Дама Вялікага Крыжа ордэна Святой Кацярыны, аднойчы згарэла сама – на 46-м годзе жыцця прыняла лекі, каб спыніць чарговую (13-ю!) цяжарнасць. «Легендарная вавёрка Бераставіцы» пахаваная ў Санкт-Пецярбургу ў 1798 г.

Памяць аб ёй захоўвае гарадскі герб Вялікай Бераставіцы, дзе на шляхецкім полі сядзіць на скрутку залатая вавёрка Юзэфіна.

Андрэй ВТАРУШЫН,
настаўнік Бераставіцкай дзіцячай школы мастацтваў

Гарадская ратуша (XIX ст.)

Пад сонцам маладзіковым

У 1990 годзе наша дзяржава шырока адзначала 500-я ўгодкі з дня нараджэння Францішка Скарыны – першадрукара, вучонага, асветніка і культурнага дзеяча, перакладчыка і пісьменніка эпохі Адраджэння. На працягу 1517–1519 гадоў у чэшскай Празе ён выдаў «Псалтыр» і 23 кнігі «Бібліі». А пасля ў Вільні, у даўняй культурнай сталіцы беларусаў і жамойтаў, былі выдадзеныя «Малая падарожная кніжка» (1522) і «Апостал» (1525).

16 лістапада 1990 года дзясяткі нашых суайчыннікаў прыбылі ў старажытную Вільню на адкрыццё мемарыяльнай шыльды скульптара Эрыкаса Варнаса ва ўшанаванне першадрукара Ф. Скарыны на вуліцы Вялікай, 15.

З той урачыстай падзеі фотааб'ектыў зафіксаваў аблічча Лявона Луцкевіча, Уладзіміра Конана, Генадзя Каханоўскага, Адама Мальдзіса, Маргарыты Пяровай, Міхася Ткачова, Аляксея Марачкіна, Міколы Купавы, Міколы Ермаловіча...

І вось з кадра паглядае нястомны Анатоль Белы. Сёлета 10 снежня споўнілася 75 гадоў з дня яго нараджэння. Сёння мы можам пералічыць некаторыя яго заслугі, праявы творчасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі. Так, Анатоль Яўхімавіч – навуковец, калекцыянер, стваральнік Старадарожскага мастацкага музея, заснавальнік і старшыня грамадска-асветніцкага клуба «Спадчына» ў 1984 годзе, сябар Саюза мастакоў з 1995 года і Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1999 года, выдавец альманахаў «Скрыжалі "Спадчыны"»...

Анатоль адышоў ад нас 14 лістапада 2011 года. А я памятаю і вераснёўскія 1990 года сустрэчы з ім у амерыканскім Кліўлендзе, калі мы былі запрошаныя на «Сустрэчу беларусаў», дзе разам прысутнічалі на адкрыцці культурнага цэнтра амерыканскіх беларусаў «Полацак». Здзейсненае – застаецца, створанае яго сэрцам – узбагачае нас і сёння.

Сяргей ПАНІЗЬНІК,
пісьменнік, стваральнік прыватных краязнаўчых музеяў на Віцебшчыне

Спыніліся каля шыльды беларускаму асветніку Ф. Скарыну ў Вільні Анатоль Белы, Вячка Целеш, кс. Уладзіслаў Чарняўскі, Сяргей Панізьнік (16 лістапада 1990 г., з архіва С. Панізьніка)

Кастусь Каліноўскі

(дадатак да мемуараў Якуба Гейштара, 1913 г.)

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 50-х угодкаў Студзеньскага паўстання, у 1913-м польская супольнасць вяла актыўную працу па выданні ўспамінаў вядомых удзельнікаў падзеяў 1863–1864 гг., сярод якіх выдзяляліся мемуары Якуба Гейштара (1827–1897). Нагадаю, што Гейштар быў кіраўніком Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы, лідарам «белых» і ідэйным праціўнікам Кастуся Каліноўскага *(Pamietniki Jakyba Gieysztora z lat 1857–1865. 2 t. Wilno, 1913)*. Важным элементам успамінаў Гейштара зрабіліся дадаткі да іх, у большасці сваёй – бібліяграфічнага характару. Гэта вынік працы некалькіх даследчыкаў, сярод якіх і Людвіг Чарноўскі. Відавочна, менавіта ён стаў аўтарам змешчанай тут даведкі на Кастуся Каліноўскага *(Т. 1. S. 370–371)*.

У аснову даведкі, акрамя ўспамінаў Нікоціна і Масолава ды артыкула Licza («Gazeta Wilenska», 1906, № 17), былі пакладзеныя таксама лісты сястры Каліноўскага Казіміры Багушэвічавай ды спадарыні Марыі Плаўскай (апублікаваныя ў артыкуле Алеся Смаленчука «Асоба Кастуся Каліноўскага як даследчая праблема» ў зборніку «Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі», 2011).

У самой даведцы прыведзены шэраг цікавых момантаў, напрыклад, згадка пра «шматлікія рукапісы» Віктара Каліноўскага, якія былі прададзеныя ў Варшаву. Як і тлумачэнні блытаніны фактаў жыцця братоў Віктара і Кастуся Каліноўскіх, паколькі апошняму прыпісвалі дасягненні старэйшага брата (напрыклад, так зрабіў Браніслаў Лімановскі ў сваіх працах). Таксама прыводзіцца тлумачэнне ўжывання ў адносінах да Каліноўскага такой характарыстыкі, як «сын ткача», аднак зроблена гэта без уліку той адмоўнай канатацыі дадзенага азначэння, якую выкарыстоўвалі ідэйныя праціўнікі – сучаснікі Каліноўскага, каб прынізіць Кастуся, паколькі таго называлі «мужыком» за яго погляды на ролю і падтрымку сялянства ў паўстанні. У той жа час, Каліноўскаму акрамя «Мужыцкай праўды» прыпісваецца аўтарства адозвы «Пісьмо ад Яські Гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай», што ў даследчыкаў выклікае вялікае пытанне.

Помнік Я. Гейштару на могілках у Варшаве

Вікенцій Канстанцін Каліноўскі – адзін з самых дзейных удзельнікаў паўстанцкай арганізацыі ў Вільні, пра выключную ролю якога неаднаразова ўзгадваюць названыя ўспаміны. У нас атрымалася сабраць ад сям'і наступныя дадзеныя пра яго.

Я. Гейштар

Ён нарадзіўся 21 студзеня (паводле новага стылю 2 лютага. – **В.Г.**) 1838 года ў Мастаўлянах Ялоўскай парафіі Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні. Бацька Сымон і маці Вераніка з Рыбінскіх – са шляхты, мелі ў Якушоўцы за 10 вёрстаў ад Свіслачы (Ваўкавыскага павета) фабрыку ткацкіх вырабаў; таму К. Каліноўскі раз-пораз і называецца «сынам ткача», хоць такое азначэнне даволі недакладнае, бо паводле інфармацыі Сымон Каліноўскі меў толькі агульны нагляд над фабрыкаю і прафесійным ткачом не быў. (Даследчык Вячаслаў Шалькевіч сцвярджае, што ткацкую фабрыку Сымон Каліноўскі заснаваў, а не быў простым наглядчыкам, у Мастаўлянах, а пазней, калі сям'я набыла фальварак Якушоўка і пераехала, то прадпрыемства перавезлі туды. – **«КГ»**.)

Пасля заканчэння пяці класаў гімназіі ў Свіслачы, Канстанцін падаўся ў Пецярбург. Туды яго забраў старэйшы брат Віктар, які на той час працаваў у Імператарскай публічнай бібліятэцы і пакінуў шматлікія рукапісы, пазней прададзеныя ў Варшаву – невядома каму. Канстанцін, пасля адпаведнай падрыхтоўкі і экзаменаў, паступіў у Пецярбургскі ўніверсітэт і навучаўся на аддзяленні камеральных навук юрыдычнага факультэта, які скончыў са ступенню кандыдата (ва ўспамінах Гейштар называе яго «эксстудэнт Пецярбургскага ўніверсітэта»).

Перад паўстаннем ён вярнуўся дамоў, зрабіўся разам з Эдмундам Вярыгаю, Янам Казелаю і іншымі (імёны якіх падаюцца ва ўспамінах) адным з самых дзейных прадстаўнікоў «Камітэта руху». Ужо тады яго шукала паліцыя, бо, калі праз два тыдні пасля смерці брата Віктара (памёр ад сухотаў у кастрычніку 1862 года) Канстанцін прыбыў дадому на адзін дзень, адразу ж пасля яго ад'езду прыбыла са Свіслачы і паліцыя і цікавілася ім.

Пасля выдзялення «Камітэта руху» (арганізацыя «чырвоных») з грамадзянскай арганізацыі («белых») у Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы Каліноўскі быў, як вынікае з успамінаў Гейштара, самым руплівым, а адначасова самым радыкальна настроеным яго сябрам. Гэта ён стварыў арганізацыю ў Гродне, ездзіў у Коўна, хацеў абудзіць народныя масы і выдаваў у таемнай друкарні на беларускай мове газетку «Мужыцкая праўда» (некалькі нумароў якой – вельмі рэдкіх – мае музей графа Мураўёва ў Вільні), а таксама адозвы на той жа мове, як, напрыклад, «Пісьмо ад Яські Гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай».

Акрамя ўсяго, папросту гуляючы з небяспекаю, прысутнічаў на амаль кожным смяротным пакаранні ў Вільні, з пашпартам Вітольда Вітажэнца жыў у Святаянскіх мурах, дзейнічаў цягам 1863-га года і быў напрыканцы, пасля выезду іншых на эміграцыю, арыштаў і смяротных пакаранняў, адзіным прадстаўніком цэнтральнай паўстанцкай улады ў Літве. Быў К. Каліноўскі схоплены толькі ў студзені 1864 года праз сведчанні Парфіяновіча, зробленыя для Камісіі А. Лосева ў Мінску.

Пасля двухмесячнага следства ў дамініканскіх мурах, дзе кіраваў генерал Сабалеўскі, Каліноўскі быў пакараны праз павешанне на Лукішскай плошчы Вільні 10/23 сакавіка 1864 года ва ўзросце 26 гадоў. Пад шыбеніцай, пад час зачытвання прысуду, у якім ён быў названы шляхціцам, выгукнуў: «Шляхты няма, усе роўныя!» Гэта было апошняе пакаранне, выкананае ў часы Мураўёва ў Вільні.

Тут варта адзначыць, што: 1) падвойнае імя Каліноўскага (Вікенцій Канстанцін, і імя брата – Віктар) дало падставы да некалькіх баламуцтваў ва ўспамінах пра 1863 год; 2) Канстанцін Каліноўскі не мае нічога агульнага (акрамя прозвішча) з Юзафам, сынам дырэктара Шляхецкага інстытута, таксама актыўным сябрам арганізацыі ў Вільні.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК,
гісторык, в. Васілевічы Слонімскага раёна

Слуцкія паясы — рарытэт Беларусі

Уздоўж

1. Кафтан з шырокімі адкіднымі рукавамі; заможныя шляхціцы ВКЛ падпаясвалі яго каштоўнымі, перавітымі залатымі і срэбнымі ніцямі, слуцкімі паясамі. **4**. Звязка, ахапак. **6**. «І тчэ, забыўшыся, рука, // Замест персідскага ўзора, // ... радзімы васілька». З верша М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі». **9**. ...! Вокліч з пераможнай інтанацыяй. **10**. Мануфактура-.... Фабрыка па вытворчасці слуцкіх паясоў, якую заснаваў спачатку ў Нясвіжы, затым у Слуцку князь, мецэнат Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька. **11**. Адценне мовы. **12**. Вада салёных вадаёмаў з высокай канцэнтрацыяй соляў. **14**. Каштоўная папера. **15**. Скульптура, якая ўпрыгожвае ўваход у Слуцкую ткацкую фабрыку мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы». **19**. Частка адзення, якая аблягае найбольш вузкую частку тулава чалавека. **20**. У ткацкім станку катушка вялікіх памераў, на якую намотваюцца ніткі асновы. **21**. Тканіна, фабрыкі па вырабе якой некалі існавалі ў Нясвіжы, у мястэчках Цімкавічы, Ружаны і ў іншых паселішчах Беларусі. **22**. Збудаванне вялікіх памераў. **24**. Папяровыя ніткі тканіны, якія пераплятаюцца з падоўжанымі. **25**. «Той пояс носяць толькі важныя ... – // На светлы бок днём свят, на чорны – у дні жалобы». З паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». **28**. Тое, што і веялка. **31**. Лічбавая ацэнка поспехаў. **33**. Чалавек, які можа ператварацца ў ваўка. Паводле павер'яў, калі яго падпаясвалі поясам, ён станавіўся ваўком да таго часу, покуль пояс не сатлее. **34**. Збудаванне ў сялянскай хаце. Некалі пры ўваходзе ў хату жаніха маладая, каб задобрыць духаў хаты і продкаў, клала на ... пояс. **35**. Касцюм танцаўшчыцы з ліфа і пышнай спадніцы. **36**. Насякомае. **37**. Верхняя мужчынская вопратка, падбітая футрам са зборкамі ў таліі (састар.).

Упоперак

1. Прыстасаванне для ручнога прадзення. **2**. Гук музыкі. **3**. Ці ..., ці кравец – не стралец, а майстар (прык.). **4**. «Гэты слаўны ... // Мне случанка падарыла». З верша Рыгора Крушыны «Паясок». **5**. Зімняе свята; у час яго пры варожбе дзяўчаты выкарыстоўвалі пояс. **6**. «Ды ... не робіцца ў сэрцах жывых, // Калі там жыве Беларусь і спявае, // І поясам слуцкім сябе абвівае». З верша В. Шніпа «Балада Альфрэда Ромера». **7**. Падсмажаная лустачка хлеба. **8**. Асоба, якая ведае грашамі ўстановы. **13**. Якая пража, такое і ... ляжа (прык.). **16**. Асоба, узнагароджаная ордэнам. **17**. Тое, што і вянец. **18**. «Слуцкія паясы – ... лёсу». Хроніка-дакументальны фільм «Беларускага відэацэнтра». **21**. Той, які старанна, але з фармалізмам, ставіцца да сваіх абавязкаў. **23**. Маёмасць, якая пасля смерці яе ўладальніка пераходзіць у чыю-небудзь уласнасць; па ... перадаваліся і каштоўныя слуцкія паясы. **26**. Прылада для намотвання нітак на цэўкі – драўляныя палачкі. **27**. Народная эпічная песня пра багатыроў і іх подзвігі. **29**. Паштовая ... «Слуцкія паясы», выпушчаная ў абарот у сакавіку 2014 г. **30**. Слуцкія паясы – бясцэнны ..., рарытэт Беларусі. **32**. Горад тэкстыльшчыкаў у Францыі, дзе ў XIX ст. вырабляліся аналагі слуцкіх паясоў. **34**. ... араць – не рукамі махаць (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ



Што рабіць, калі гарыць

Канечне, кожнаму хочацца думаць, што ва ўсіх грамадскіх установах, якія мы наведваем, строга выконваюцца правілы бяспекі, сістэма апавяшчэння аб пажары добра наладжаная, а ў выпадку непрадбачанай сітуацыі самі супрацоўнікі змогуць патушыць пажар не горш за прафесіяналаў гэтай справы.

Як паведамляюць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, сёлета ў Беларусі адбылося больш за 5 700 пажараў, на якіх загінула амаль шэсцьсот чалавек. Пры гэтым больш за 4 000 чалавек было эвакуявана, каля чатырохсот атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.

Што ж рабіць, калі пажар усё-такі адбыўся? У гэтым выпадку супрацоўнікам неабходна дакладна выконваць наступныя парады:

1. Таму, хто першы заўважыў пажар, трэба неадкладна паведаміць пра здарэнне ў пажарную службу па тэлефоне 101, назваць дакладны адрас установы, месца пажару, сваё прозвішча і пасаду.

2. Задзейнічаць сістэму апавяшчэння пра пажар.

3. Пачаць эвакуацыю людзей.

4. Паведаміць пра пажар кіраўніку ўстановы.

5. Да прыезду пажарнай службы пачаць тушыць агонь, выкарыстоўваючы ўнутраныя пажарныя краны, вогнетушыцелі і інш.

Натуральна, што асноўная адказнасць у такой сітуацыі кладзецца на кіраўніка пэўнага аб'екта ці ўстановы, якому неабходна:

1. Пераканацца, што пра пажар паведамілі ў пажарную службу, не дапускаць панікі.

2. Арганізаваць эвакуацыю людзей, быць пэўным, што яны знаходзяцца ў бяспецы ад магчымага абвальвання канструкцыяў, паражэння электрычным токам і інш.

3. Арганізаваць уключэнне сістэмы апавяшчэння пра пажар, калі ёсць гучная сувязь, аб'явіць, што неабходна пакінуць памяшканне.

4. Накіраваць работнікаў для суправаджэння пажарнай службы да месца пажару.

5. Праверыць, ці ўключаная аўтаматычная стацыянарная сістэма пажаратушэння.

6. Вывесці з небяспечнай зоны ўсіх работнікаў, якія не займаюцца эвакуацыяй і ліквідацыяй пажару.

7. Пры неабходнасці выклікаць медыцынскую і іншыя службы.

8. Адключыць сеткі электраабсталявання, сістэмаў вентыляцыі і інш.

9. Арганізаваць эвакуацыю матэрыяльных каштоўнасцяў з небяспечнай зоны, вызначыць месца, дзе іх можна скласці, пры неабходнасці забяспечыць ахову.

Калі на месца здарэння прыедзе пажарная служба, неабходна:

1. Паказаць кіраўніку тушэння пажару месца загарання і найкарацейшыя шляхі да яго.

2. Паведаміць пра ход эвакуацыі і пра тое, ці знаходзяцца ў небяспечнай зоне людзі.

3. Паказаць крыніцы водазабеспячэння, забяспечыць доступ да сродкаў сувязі.

Дзяніс ПРОЦЬКА, начальнік ЦРАНС г. Мінска

Прынёманскі край на Стаўбцоўшчыне з даўніх часоў славіўся маляўнічымі краявідамі, квяцістымі духмянымі лугамі, і ўвайшоў у гісторыю як родны кут Якуба Коласа. Прырода. Без яе мы не можам пражыць і дня. Колькі дзівосных хвілінаў дорыць яна ў любую пару года. Нас зачароўвае прыгажосць яе лясоў і палёў, лугоў, азёраў і рэк.

У кожнага ёсць свая рака дзяцінства. Малая ці вялікая, якая ў большасці з нас будзіць пачуцці непаўторнай прыгажосці і лагодзіць душу ўспамінамі пра цудоўны час бесклапотнага маленства. Для Якуба Коласа, без сумнення, такой ракой быў наш славуты Нёман. Менавіта ён жывіў песняра, яго творчую музу цудадзейнай сілай паэтычнага натхнення. Гэтай рацэ прысвечаныя самыя шчырыя і па-мастацку прыгожыя словы.

Нёман. Хто яго толькі не ўслаўляў, не складаў яму песні. Але ж гэта не проста рака, якая цякла, цячэ і будзе цячы па Беларусі. Ён – сведка многіх падзеяў, што адбыліся на нашай зямлі, асяродак, дзе спрадвеку жылі людзі.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі я знайшла адну цікавую гістарычную кнігу – «Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы» (т. 1. 1921 – 1929 гг., 1962), дзе ўзгадваецца пра рэчку і мястэчка Стоўбцы:

«Крупнейшей пристанью на Нёмане были Столбцы, местечко Минской губернии, но различные суда ходили по Нёману и выше Столбцов – от местечка Сверженя или даже от устья Усы, притока Нёмана. Владислав Сыракомля, бывший в Столбцах перед самой реформой (рэформа 1861 г. – **«КГ»**), писал, что там было 20 государственных и 17 частных амбаров. Зимой и летом в Столбцы шли транспорты с разнообразными товарами. В амбарах производились очистка льна и пеньки, для чего требовалось много работников. «Дороговизна рабочих, – писал Сыракомля, – неслыханная: один человек может заработать в день 10 золотых ассигнациями (около 1 р. 50 коп.)». В 1857 году из Столбцов отплыло в Кёнигсберг 125 витин, каждая стомостью в 25 тысяч рублей, всего же в том году нз Столбцов было отаправлено товаров на 3 125 тысяч рублей».

На Стаўпянскай прыстані

Паводле дакументаў 1855 – 1860 гадоў на прыстані грузіліся наступныя тавары: жыта, мука жытняя, пшаніца, авёс, ячмень, гарох, грэчка, ільняное семя, канаплянае семя, крупа, ільновалакно, пянька, пакля, масла поснае, сала, бярвенні, брусы, дубовая клёпка.

Прыбывалі і выгружалі: соль, селядцы, шампанскае і іншыя замежныя віны, фаянсавы і іншы посуд, цукар, перац і іншыя прадукты, стальныя, жалезныя, чыгуначныя вырабы, бляхі, свінец, волава, баваўняную паперу і пражу, чырвонае дрэва.

Млыны

Чалавечая абыякавасць, ваеннае ліхалецце, час і прагрэс знішчылі вадзяныя млыны. Цяпер рэшткі плацін і старыя палі, якія тырчаць з вады, нагадваюць нам аб існаванні на нашай зямлі гэтых старажытных збудаванняў. І калі ветраных млыноў захавалася некалькі, то вадзяных практычна не засталося. І мы ўжо ніколі не пачуем шуму вады, што падае на вадзяное кола, не возьмем у рукі цёплую, свежазмолатую муку, не ўдыхнем яе паху. З кожнай стратай наша культура і традыцыя становіцца крыху бядней.

Гарадская прыстань на Нёмане

(Працяг на стар. 8)

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

Для гаспадарчых патрэбаў у далёкія даваенныя гады ў Стоўбцах будаваліся рознатыповыя млыны. На цяперашняй плошчы Бессмяротнасці на ўзгорку стаяў ветраны млын, які ў канцы 20-х гадоў быў разбураны. На рацэ Адцэдка ў вёсцы Задвор'е было возера, вада якога цякла па драўляным латку на кола вадзянога млына. Ад яго засталіся толькі мураваныя сцены. Далей рэчка Адцэдка цякла ў возера Віткоўскага, што ў Стоўбцах.

Па дарозе са Стоўбцаў на Акінчыцы быў драўляны шлюз. Вада з гэтага возера праз шлюз па латку цякла на кола вадзянога млына Віткоўскага і далей трапляла ў рэчку Адцэдка, што ўпадала ў Нёман. Гэты млын быў драўляны і ў пачатку 30-х гадоў згарэў. Трэба адзначыць, што па дарозе на Акінчыцы па правым баку ў абодва бакі ад млына былі пабудаваныя земляныя прамавугольныя басейны. Да гэтых басейнаў па трубах паступала вада з возера. Сюды запускаліся малькі, гадавалі тут карасёў, карпаў, лінёў і нават шчупакоў.

У кожным басейне быў свой від рыбы. Пры патрэбе з басейна спускалася вада ў рэчку, і гадавалую рыбу збіралі ў кашы і адвозілі на продаж. У пусты басейн зноў запускалі з возера ваду і малькоў для гадоўлі.

У канцы цяперашняй вуліцы Гагарына разам з лесапілкай быў паравы млын Кітаевіча. Паміж будынкам цяперашняй раённай бібліятэкі і на рагу вуліцы Піянерскай і плошчы быў самы буйны паравы млын з кацельняю Куртава.

Каля чыгуначнага пераезда на Акінчыцы быў таксама млын, будынак якога захаваўся і ў ім размешчаны склад.

На ўсіх млынах малолі зерне, жыта, пшаніцу, ячмень, а таксама абдзіралі ячмень на крупы.

Запруды

Па цячэнні Нёмана з правага боку ў межах горада Стоўбцы, каб зменшыць хуткасць плыні ракі, былі пабудаваныя запруды з каменю. У заспакоенай вадзе асядаў глей, дзякуючы чаму рэчышча Нёмана не заглейвалася і было глыбокім. Запруды будаваліся ў выглядзе каменных пераходаў у форме квадратаў, дзе вада знаходзілася ў спакойным стане. Увесну ў гэтыя запруды заходзіла на нераст рыба, тут добра разводзіліся малькі. А таксама па гэтых каменных пераходах можна было падыходзіць да асноўнай плыні ракі, сюды быў свабодны доступ для рыбацкіх лодак.

Рыбу можна было лавіць вудай без ўсякага дазволу. А вось каб хадзіць у лес, патрэбна было браць спецыяльны білет. Ён выдаваўся ў лясгасе на сезон. Яго можна было перадаваць каму-небудзь яшчэ, такое дазвалялася. Заўсёды свае ўладанні на кані аб'язджаў ляснічы. Калі ён сустракаў у лесе людзей, заўсёды пытаўся, ці маюць яны дазвол тут знаходзіцца.

Людзі беражліва ставіліся да роднай прыроды, наваколля, а прырода шчыра адказвала дарамі, адпачынкам і заспакаеннем.

Запруды на Нёмане

(Працяг будзе)

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 45

***Уздоўж*:** **1.** «Надзея». **4.** Райніс. **6.** Скарына. **9.** Іван. **10.** Княства. **11.** Гаўя. **14.** Тромб. **15.** Дасье. **18.** Янка. **19.** Райманд. **22.** Блог. **23.** Дзвінск. **24.** Кемеры. **25.** Апарат.

***Упоперак*:** **1.** Наліў. **2.** Ясак. **3.** Ярус. **4.** Рада. **5.** Стаяк. **7.** Ластоўскі. **8.** Саласпілс. **12.** Сабор. **13.** Ордэн. **16.** Пясок. **17.** Ігнат. **19.** Руды. **20.** Маіс. **21.** Дэка.

Снежань

24 – Бялова Антаніна Аляксееўна (1924 – 1993), мастак кіно, жывапісец, заслужаны работнік культуры Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

24 – Даленга-Хадакоўскі Зарыян Якаўлевіч (сапр. **Чарноцкі Адам**; 1784, Лагойскі р-н – 1825), славяназнаўца, адзін з пачынальнікаў беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі – 230 гадоў з дня нараджэння.

24 – Іаасаф Магілёўскі (свецкае імя **Жавахаў Уладзімір Давыдавіч**; 1874 – 1937), князь, свяшчэннамучанік, епіскап – 140 гадоў з дня нараджэння.

24 – Рублеўскі Сяргей Васільевіч (1954, Лепельскі р-н), паэт, празаік, публіцыст – 60 гадоў з дня нараджэння.

24 – Хаўратовіч Іосіф Пятровіч (1929, Круглянскі р-н), вучоны-гісторык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1983), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) – 85 гадоў з дня нараджэння.

24 – Энгельгарт Аўген фон (1899, Латвія – 1948), нямецкі гісторык, які вывучаў гісторыю Беларусі, – 115 гадоў з дня нараджэння.

25 – Лагоўская Алена Іванаўна (1904, Чэрвень – 1981), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

25 – Міхась Чавускі (**Міхаіл Маркавіч**; **Майсей Моталевіч**; 1904, Жлобінскі р-н –1984), пісьменнік, драматург, сатырык – 110 гадоў з дня нараджэння.

25 – Нацыянальны парк «Белавежская пушча» (Камянецкі, Пружанскі і Свіслацкі р-ны; 1939), дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова, уключаная ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА, – 75 гадоў з часу абвяшчэння дзяржаўным запаведнікам.

25 – Сіліановіч Нікадзім Юр'евіч (1834, Вілейскі р-н – 1919), беларускі і расійскі жывапісец, педагог, акадэмік Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў – 180 гадоў з дня нараджэння.

25 – Сцяшковіч Таццяна Піліпаўна (1904, Чэрвень – 1986), мовазнаўца, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

25 – Талаш Васіль Ісакавіч (1844, Петрыкаўскі р-н – 1946), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, народны герой – 170 гадоў з дня нараджэння.

26 – Бярковіч Марыя Веньямінаўна (1909, Беразіно – 1993), мастак кіно, жывапісец, графік – 105 гадоў з дня нараджэння.

27 – Беларускае краязнаўчае таварыства (Мінск; 1989), добраахвотная грамадская арганізацыя – 25 гадоў з часу стварэння (існавала да 1995 г.).

27 – «Лебядзіны» (цяпер у межах Мінска; 1984), біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння – 30 гадоў з часу стварэння.

27 – Макарава Галіна Кліменцьеўна (1919, Салігорскі р-н – 1993), актрыса, народная артыстка Беларусі і СССР – 95 гадоў з дня нараджэння.

28 – Ігнаценка Іларыён Мяфодзьевіч (1919, Лоеўскі раён – 2002), вучоны-гісторык, акадэмік НАН Беларусі – 95 гадоў з дня нараджэння.

28 – Саўчанка Сцяпан Уладзіміравіч (1889, Украіна – 1942), украінскі літаратуразнаўца і педагог, які даследаваў гісторыю збірання і вывучэння беларускіх казак, – 125 гадоў з дня нараджэння.

29 – Гурыч Соф'я Якаўлеўна (1919, Мінск – 1999), актрыса, рэжысёр тэатра і радыё, заслужаны работнік культуры Беларусі (1985), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984) – 95 гадоў з дня нараджэння.

29 – Касцюшка Аляксандр Ян (1629 – 1707), дзяржаўны дзеяч ВКЛ – 385 гадоў з дня нараджэння.

29 – Мянжынскі Валерый Станіслававіч (1954, Віцебск), вучоны-гісторык і археограф, які вывучае Метрыку ВКЛ, знешнюю і ўнутраную гісторыю архіва канцылярыі ВКЛ, даследуе гісторыю землеўладання ў Беларусі, вывучае гісторыю шляхецкага саслоўя, займаецца гістарычным краязнаўствам і дакументазнаўствам, – 60 гадоў з дня нараджэння.

29 – Тарасаў Віктар Паўлавіч (1934 – 2006), акцёр, народны артыст Беларусі і СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966) – 80 гадоў з дня нараджэння.

30 – Аксельрод Зэлік Майсеевіч (1904, Маладзечна – 1941), яўрэйскі паэт, публіцыст – 110 гадоў з дня нараджэння.

30 – Рубцоў Феадосій Антонавіч (1904, Расія – 1986), расійскі музыказнаўца-фалькларыст, кампазітар, педагог, збіраў і апрацоўваў беларускія і рускія народныя мелодыі – 110 гадоў з дня нараджэння.

31 – «Авадзень» (Вільня; 1924), часопіс гумару і сатыры – 90 гадоў з пачатку выдання (выходзіў да 1933 г.).

31 – Уладзіміраў Пётр Уладзіміравіч (1854 – 1902 ці пасля 1913), расійскі філолаг-славіст, гісторык літаратуры, адзін з заснавальнікаў беларусазнаўства – 160 гадоў з дня нараджэння.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

НАРО́ДНАЯ МЕДЫЦЫ́НА *(заканчэнне артыкула)*. На народную медыцыну ўплы валі таксама прымхі, містычныя ўяўленні, што спрыялі знахарству; узнікненне многіх хваробаў тлумачылі ўсяленнем у чалавека злых духаў, хворых «лячылі» вытоптваннем, выцісканнем, замовамі, шэптамі. Элементы дэманалогіі і містыкі ў практыцы народных лекараў цесна перапляталіся з рацыянальнымі прыёмамі лекавання. Звесткі пра сродкі народнай медыцыны перадаваліся з пакалення ў пакаленне вусна, адлюстраваныя ў народных звычаях, прыказках, прымаўках, паданнях, замацаваныя ў пісьмовых крыніцах (лячэбнікі, траўнікі і інш.). І ў наш час навукоўцы, краязнаўцы знаходзяць лячэбнікі XVII – XVIII стст. У 1926 г. навуковая экспедыцыя Аршанскага акруговага таварыства краязнаўства выявіла ў в. Мардашавічы Дубровенскага р-на ў сялянкі Г. Шаранды лячэбнік, па якім мясцовыя жыхары лячыліся многія гады. У лячэбніку 30 аркушаў, апісаныя 77 раслінаў, большасць з якіх мае беларускія назвы. Лячэбнік XVIII ст., знойдзены ў в. Гайдукоўцы Магілёўскага р-на, пералічвае раслінныя лячэбныя сродкі (крапіву, моркву, мяту і інш.), сродкі жывёльнага паходжання (кроў, печань, косці жывёлаў і г.д.).

Навуковая медыцына бярэ з вопыту народнай усё каштоўнае і рацыянальнае. У XIX – пач. XX ст. сродкі народных лекараў вывучалі беларускія ўрачы і этнографы: А. Антонаў, Ю. Крачкоўскі, А. Сіцынскі, М. Нікіфароўскі, А. Меер, Е. Раманаў, П. Шэйн, М. Федароўскі, К. Грум-Гржымайла, А. Сержпутоўскі і інш. Пазней, у больш блізкі да нас час, даследаваліся пытанні народнай медыцыны і дзейнасці народных лекараў у Беларусі (В. Грыцкевіч, Л. Мінько), уплыў светапогляду і ўмоваў жыцця на ўяўленні пра хваробы і метады іх лячэння ў розныя гістарычныя эпохі (Р.Р. Кручок), матэрыяльныя прыкметы бытавання народнай медыцыны паводле дадзеных старажытных пахаванняў (Л. Казей).

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 11.12.2014
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 1043.
Тыраж 920 асобнікаў.